*Віншуем з юбілеем!*

# НЯСТОМНЫ РУПЛІВЕЦ АЛЯКСЕЙ РАГУЛЯ



80

“У 80-я гады нас, выкладчыкаў Мінскага педінстытута, пасылалі летам на сенакос у Крупскі раён. Звычайна ішлі на пакос пяцёра: я, А. У. Рагуля, А. А. Каляда, К. У. Скурат і В. А. Бекіш. Калі касілі, Рагуля ішоў першы, бо першаму і рытм трымаць, і паласу весці…” – успамінае А. Лугоўскі, у 1991 – 2008 гг. дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры (цяпер у складзе факультэта беларускай і рускай філалогіі) Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.

Касец класічнай эпохі коласаўскіх касцоў, якія ідуць… і “грымяць іх косы, і ткуцца роўныя пракосы, і льецца смех іх разудалы…”. Але найперш сейбіт – *разумнага, добрага, вечнага*… Такім адказным, працавітым руплівцам, нястомным, цікаўным, рухавым сейбітам мы ведаем А. Рагулю, які нарадзіўся ў сімвалічны дзень 25 сакавіка 1935 г. у вёсцы Сенна, што на Наваградчыне. І я думаю, што не памылюся, калі скажу словы ўдзячнасці ад імя нас усіх. Тых, хто вучыўся ў Аляксея Уладзіміравіча, калі ў 1960 – 1970-я гг. ён працаваў настаўнікам Халхоліцкай і Зачысцкай школ Барысаўскага раёна, у Рэспубліканскай школе спартыўнага профілю ў Мінску. І ад імя тых, хто працаваў на кафедры беларускай літаратуры ў МДПІ імя Максіма Горкага, дзе А. Рагуля прайшоў шлях ад асістэнта, выкладчыка да дацэнта і прафесара. І ад імя тых, хто быў пакліканы на новую кафедру нацыянальнай культуры (потым тэорыі і гісторыі) у БДПУ (з 1994 г. – факультэта народнай культуры), узначаленую ў 1991 г. А. Рагулем. І ад імя тых, хто на іншых кафедрах, у іншых навучальных установах працаваў разам з ім у студэнцкіх групах, у савеце факультэта і ў вучоным савеце ўніверсітэта. А таксама ад імя тых, хто разам з А. Рагулем ствараў у 1990-я гг. праграмы і пісаў падручнікі для сярэдняй школы, рэалізоўваючы адраджэнскую праграму вывучэння беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай – каб “далучыць імгненне да вечнасці”, “каб чытач не толькі атрымаў адказы, але і паставіў сабе новыя пытанні…”.

Многія навукоўцы і настаўнікі ўдзячныя А. Рагулю за прафесійныя аповеды пра мастацкую самабытнасць прыгожага пісьменства і аўтарскую арыгінальнасць беларускіх творцаў. Удзячныя яму і беларускія пісьменнікі за шматлікія артыкулы, рэцэнзіі, навукова-метадычныя матэрыялы пра сябе, сваю творчасць. Яны галоўныя героі кніг літаратуразнаўцы “Імгненні” (1990), “Пафас станаўлення” (1991) і іншых – паэты М. Танк, П. Панчанка, А. Куляшоў, А. Пысін, Г. Бураўкін, Р. Барадулін, Н. Гілевіч, В. Зуёнак, А. Вярцінскі… празаікі В. Быкаў, А. Адамовіч, І. Шамякін, Я. Брыль, В. Казько, А. Кудравец, А. Жук…

Робячы высновы і, разам з тым, ацэньваючы ўклад беларускай літаратуры ў сусветную, А. Рагуля пісаў: «*Адной з найбольш актуальных праблем сучаснасці з'яўляецца праблема будучыні чалавецтва. Пошукі адказу на пытанне “што нам нясе шалёны век?” у сваю чаргу ставяць нас перад шэрагам новых пытанняў: што сабой уяўляе чалавек як асоба, якія ў яго магчымасці, чаго варты наш грамадскі ўклад, калі ацэньваць яго з гуманістычнага пункту гледжання…*» Думаецца, сярод тых, хто шукаў і працягвае шукаць адказ на гэтыя пытанні, А. Рагуля, як навуковец, як выкладчык, як чалавек, застаецца адным з самых нястомных. Ён працягвае працаваць у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на кафедры этналогіі і фальклору.

“…Тварыць і жыць. І кроў кіпела ў жылах…” – цытаваў П. Панчанку Аляксей Рагуля ў кнізе “Імгненні”. Словы знакамітага паэта прыгадваюцца, калі я думаю пра свайго Настаўніка. Настаўніка з вялікай літары. Таму што з ім можна, дый варта, гаварыць менавіта на ўздыме – на ўздыме творчых, прафесійных памкненняў і зацікаўленасцей. Аляксея Рагулю можна параўнаць з героямі народных эпасаў – ён такі самы неўтаймаваны, эпічна малады. Праца з моладдзю, са студэнтамі заўсёды патрабавала не толькі асабістай адказнасці і высокага прафесіяналізму, але і ўмення заставацца маладым і апантаным, нястомным і працавітым.

**Галіна АДАМОВІЧ,**
доктар філалагічных навук.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ